

УЗОР ПАЛІТЫЧНАГА ДЫЯЛОГУ 3

КІНО З ГІСТОРЫЯЙ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

24 МАЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 100 (30234)

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным, які наведвае нашу краіну з двухдзённым афіцыйным візітам.**

Перагаворы ў Палацы Незалежнасці пройдуць сёння спачатку ў вузкім, а затым і ў пашыраным складах. Бакі абмяркуюць стан і перспектывы развіцця ўсяго комплексу беларуска-расійскіх адносін: інтэграцыйныя працэсы і рэалізацыю рашэнняў, прынятых Вышэйшым дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы, палітычны дыялог, прасоўванне сумесных гандлёва-эканамічных і кааперацыйных праектаў, умацаванне бяспекі, узаемадзеянне ў гуманітарнай сферы.

У цэнтры ўвагі традыцыйна будуць таксама міжнародная тытанні, становішча ў рэгіёне, сумеснае рэагаванне на выклікі і пагрозы.

# Стваральнікі прыгажосці



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Чысціня, спакой і прыгажосць — вось тыя адметнасці Мінска, якія турысты адзначаюць у першую чаргу. А стаіць за прыгажосцю карпатлівая штодзённая праца супрацоўнікаў «Мінскзеленбуда». Іх рукамі, натхненнем і добрым настроем у нашай сталіцы створаны цудоўныя кветнікі, што радуюць вока ды здзіўляюць сваёй разнастайнасцю і гасцей горада, і яго жыхароў. **Таццяна ПАЛЬЧЭЎСКАЯ** ўжо 11 гадоў займаецца ўпрыгожваннем сталіцы, а менавіта гэтымі днямі яе намаганнямі на плошчы Незалежнасці з'явіцца яшчэ адзін астравок прыгажосці.

## КОРАТКА

- **Індэкс дзелавога аптымізму ў Беларусі павысіўся.**
- Мінская вобласць прызнана найлепшым рэгіёнам для вядзення бізнесу ў Беларусі.
- **Бюст мітрапаліта Іосіфа Сямашкі адкрылі ў Гродне.**



- Больш за 3 тысячы выпадкаў за год: у Беларусі расце колькасць ДТЗ з удзелам дзікіх жывёл.
- **Беларусь ратыфікавала змены ў пагадненне з Расіяй аб спагнанні аліментаў.**
- У Беларусі ўдасканальваецца парадак фарміравання тарыфаў на платныя медпаслугі.
- **Мармеладную навінку са смакам кактуса прэзентавалі беларускія кандытары.**
- Саўмін СД зацвердзіў праект па рамонце, рэстаўрацыі, рэканструкцыі і музеефікацыі Брэсцкай крэпасці.
- **У «Вялікім камені» можа з'явіцца прадпрыемства па вытворчасці робатаў.**

ISSN 1990 — 763X

Міжнароднае супрацоўніцтва

## У ФОКУСЕ — ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ

**Кіраўнікі адукацыйных ведамстваў Андрэй ІВАНЕЦ і Кангратбай ШАРЫПАЎ упэўнены, што супрацоўніцтва ў сферы адукацыі з'яўляецца важным фактарам для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця дзвюх краін.**

### ЦЕСНЫЯ, ДАВЕРНЫЯ, УЗАЕМАВЫГАДНЫЯ

Апроч калабарацыі ў галіне эканомікі апошнім часам на якасна новы ўзровень выйшла і супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Гэты год пачаўся з афіцыйнага візіту ў Рэспубліку Узбекістан дэлегацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на чале з міністрам Андрэем Іванцом. Падчас сустрэчы было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, якое пашырае ўзаемадзеянне дзвюх дзяржаў на ўсіх узроўнях адукацыі.

У якасці пацвярджэння намераў Мінск наведала дэлегацыя кіраўнікоў рознага ўзроўню сістэмы адукацыі Рэспублікі Узбекістан, якую ўзначаліў міністр вышэйшай адукацыі, навукі і інавацый Кангратбай Шарыпаў.

### НА АДЗІНАЙ ПЛАТФОРМЕ

Падчас візіту прайшло буйное міжнароднае мерапраемства — першы Беларуска-Узбекскі форум прафесійнай адукацыі. Адпаведна і прадстаўніцтва з абодвух бакоў было шырокім — больш за 100 спецыялістаў навукова-адукацыйных арганізацый, міністэрстваў і ведамстваў з абедзвюх краін. У Мінск прыбылі кіраўнікі Інстытута развіцця прафесійнай адукацыі пры Міністэрстве вышэйшай адукацыі, навукі і інавацый Рэспублікі Узбекістан, рэктары вядучых узбекскіх ВНУ, дырэктары ўстаноў прафесійнай адукацыі. Беларускі бок узначаліў міністр адукацыі Андрэй Іванец.

СТАР. 3

На кантролі

## «ШЭРАЯ» ЗАРПЛАТА — СУМНЫЯ ВЫНІКІ

### Што губляюць работнік і дзяржава?

**Выплачваючы зарплату без адлюстравання ва ўліку, наймальнік прычыняе шкоду не толькі дзяржаве, але і работнікам. Зарплата «ў канвертах» не гарантуе атрымання абумоўленага заробку, цягне за сабой несправядлівы памер будучай пенсіі. Безумоўна, у выплаце і атрыманні такога заробку ўдзельнічаюць як наймальнік, так і працоўнік. Тым не менш самым неабароненым у дадзенай сітуацыі з'яўляецца апошні. Згаджаючыся на атрыманне такой зарплаты, работнік часам не задумваецца аб наступствах. Нярэдка людзей ставяць перад выбарам: атрымліваць частку грашовых сродкаў неафіцыйна або страціць работу. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся аб непрыемных наступствах такога заробку.**

### АДКАЗНАСЦЬ ДВУХ БАКОЎ

«Пры правядзенні праверачных мерапрыемстваў органы Камітэта дзяржаўнага кантролю звяртаюць пільную ўвагу дадзеным незаконным выплатам і арыентаваны на іх выяўленне, — расказаў **намеснік начальніка аддзела прававога забеспячэння, інфармацыі і работы са зваротамі грамадзян Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Юрый КАРДЫМОН.** — Гэты кірунак для нас не новы, але асабліва гэтай тэмай Камітэт дзяржаўнага кантролю зацікавіўся з 2020 года. У нас выпрацаваны алгарытм правядзення кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў па супрацьдзеянні дадзеным фактам, які ўключае ўзаемадзеянне з падатковымі органамі і Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва».

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «УНС — ГЭТА ПАЛІТЫЧНАЯ ЯДЗЕРНАЯ ЗБРОЯ»

## Рашэнні стратэгічнага характару

**Месяц таму прайшло першае пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу ў яго новым, канстытуцыйным статусе. Былі вырашаны ўсе першачарговыя кадравыя пытанні: абраны Старшыня УНС, яго намеснік, члены Прэзідыума, а таксама прыняты найважнейшыя для краіны дакументы — Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. Але гэта толькі пачатак вялікай працы. Як яна будзе выбудавана, Прэзідэнту Беларусі, Старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандру Лукашэнку дакладвалі намеснік старшыні Аляксандр Косінец і начальнік сакратарыята УНС Валерый Міцкевіч.**

«Я прасіў вас, каб вы сур'ёзна з зацікаўленымі і адказнымі асобамі падумалі пра тое, як нам выбудаваць сістэму работы з дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу. Нам трэба было вызначыцца і па структуры: як мы будзем дзейнічаць у Сакратарыяце і ўвогуле якая будзе структура ў краіне. Структура і сістэма, — абазначыў галоўныя пытанні Аляксандр Лукашэнка. — Нам трэба спланаваць работу, таму для нас будуць важныя і планы работы — і Прэзідыума УНС, і ў цэлым дэлегатаў».

Ён пацікавіўся, што ўжо зроблена, што яшчэ трэба зрабіць, што неабходна ад Старшыні УНС. «Галоўнае — гэта сувязь (ваша сувязь, мая сувязь, Прэзідыума) з дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, каб яны не адчувалі сябе адхіленымі і адсунутымі ад тых пытанняў, якія ім трэба вырашаць. Нам вельмі важна паказаць грамадству і дэлегатам, што яны не павінны падмяняць іншыя органы ўлады», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У кіраўнічыя органы УНС ужо паступаюць звароты грамадзян. Старшыня УНС падкрэсліў, што яны будуць працягвацца. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на двух момантах. Першы — зваротамі грамадзян павінны займацца, найперш, дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. Другі — звароты ва УНС — гэта не тое самае, што звароты ў выканаўчыя структуры, мясцовыя органы ўлады і нават у Адміністрацыю Прэзідэнта. «УНС — гэта зусім іншы орган, які платы і дахі не рамантуе, але, тым не менш, адштурхнуцца ад звароту людзей і сказаць, што гэта не наша справа, таксама нельга. Таму працу трэба выбудаваць так, каб, калі чалавек звярнуўся ва Усебеларускі народны сход, мы маглі гэты зварот давесці да адпаведных органаў для вырашэння. Але галоўнае — паказаць людзям, што гэта — не работа УНС. УНС — гэта палітычная ядзерная зброя, якая выкарыстоўваецца ў выключных выпадках, калі трэба будзе правесці пазачарговы сход. Гэта рашэнні толькі стратэгічнага характару — не платы і не дахі, нават не балконы. Але ў той жа час мы не можам ад людзей адмахвацца. Таму з дэлегатамі трэба ўстанавіць такую сувязь, каб, маючы зносіны з імі, мы маглі давесці для вырашэння той ці іншы зварот нашых людзей», — падкрэсліў беларускі лідар.

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на ўзаемадзеянне Прэзідыума УНС, як кіруючага органа, з дэлегатамі. Зразумела, што з кожным дэлегатам немагчыма камунікаваць пастаянна. «Думаю, што з кожным дэлегатам вы ў зносінах не будзеце ўвесь час, а вось з групамі... Як гэтыя групы будуць выглядаць? Трэба падумаць і выбудаваць гэтую работу. А потым правядзём пасяджэнне Прэзідыума і ўсё гэта зацвердзім», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### ДЭЛЕГАТАЎ УНС ЧАКАЕ КАРПАТЛІВАЯ ШТОДЗЁННАЯ ПРАЦА

**Намеснік Старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандр КОСІНЕЦ** расказаў журналістам, якія пытанні абмяркоўвалі на дакладзе ў Прэзідэнта. Сярод асноўных — арганізацыя і кіраванне Усебеларускім народным сходам. Вертыкаль павінна быць выбудавана наступным чынам: Старшыня УНС — яго намеснік — Прэзідыум — Сакратарыят — дэлегаты УНС. Па словах Аляксандра Косінца, плануецца стварыць 10 дэлегацый, у тым ліку ад урада (пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра), ад рэгіёнаў (на чале са старшынямі аблвыканкамаў), ад парламентарыяў і дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, ад судовай улады.

«Галоўнымі аспектамі іх работы стануць аператыўнасць (дзеянне, здольнасць выканаць пастаўленую задачу), кантроль (праверка, ці правільна выбрана дзеянне), эфектыўнасць і стараннасць (дысцыпліна)», — расказаў Аляксандр Косінец. Ён падкрэсліў, што дэлегаты УНС будуць працаваць не ад пасяджэння да пасяджэння, як гэта было раней, а на пастаяннай аснове. У іх наперадзе штодзённая карпатлівая работа, падтрыманне сувязі з насельніцтвам, работа са СМІ. «Кіраўніцтва УНС будзе ў абавязковым парадку сустракацца з дэлегатамі на месцах, каб бачыць і разумець, як арганізавана работа, якія ёсць праблемы, якую дапамогу неабходна аказаць у частцы вырашэння тых ці іншых пытанняў, — сказаў Аляксандр Косінец. — Гэта ўжо зусім іншая платформа, іншыя механізмы, падыходы ў арганізацыі і кіраванні УНС, чым у папярэдніх гады, калі ад аднаго да другога з'езда проста галасаванне і ўсё. Неабходна штодзённая пастаянная праца, што будзе адчувальнай дапамогай для ўсіх галін улады. Гэта дзейсны, высокага рангу, прадстаўніцтва орган, які дае магчымасць вырашаць усе праблемы, задачы будаўніцтва дзяржавы для народа».

Падчас даклада Прэзідэнту абмяркоўваліся таксама функцыянальныя абавязкі членаў Прэзідыума УНС, пытанні планавання пасяджэнняў Прэзідыума УНС і самога Усебеларускага сходу. Размова ішла і пра закон аб УНС, прыняты ў лютым 2023 года, у частцы, якая датычыцца яго эфектыўнасці. З гэтай нагоды Аляксандрам Лукашэнкам пастаўлена задача, каб УНС ні ў якім разе не падмяняў выканаўчую, заканадаўчую або судовую ўладу, не перашкаджаў працаваць гэтым галінам улады, але, дзе неабходна, падказаў, як зрабіць лепш. Арганізацыяй і ўпраўленнем работы УНС будзе займацца невялікі штат супрацоўнікаў — 14 чалавек, на сёння — 11. «Гэта вельмі нязначная колькасць людзей, якія будуць поўнасцю разглядаць усе пытанні: і арганізацыі, і кіравання, і падрыхтоўкі, і сувязі з рэгіёнамі, з дэпутатамі. Дэлегацыі, утвораныя ў абласцях, будуць мець свае камісіі, якія працуюць на грамадскіх пачатках, яны будуць абменьвацца меркаваннямі, уносіць прапановы», — растлумачыў Аляксандр Косінец. Работа Усебеларускага народнага сходу, усіх яго структур і дэлегатаў будзе шырока асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі. Такі падыход, паводле слоў намесніка старшыні УНС, падтрымаў Аляксандр Лукашэнка.

Намеснік старшыні УНС таксама звярнуў увагу на тое, якую ролю адыгрывае Усебеларускі народны сход для падтрымання і развіцця ідэалогіі беларускай дзяржавы. «Ідэалогія ў нас у краіне ёсць і галоўная ідэя сфарміравана: разам за моцную і квітнеючую Беларусь. Разам — кансалідаванае грамадства, незалежна ад нацыянальнасцяў, веравызнання, прыналежнасці да тых ці іншых канфесій. Моцная — гэта магутная эканоміка, Узброеныя Сілы, здольныя абараніць мірную працу нашых людзей. Квітнеючая — гэта людзі, якія жывуць у дабрабыце, і вельмі шмат дзіцячых калясак на вуліцах гарадоў і вёсак нашай краіны. Вось наша ідэалогія. І мы яе ў абавязковым парадку рэалізоўвалі, рэалізоўваем і будзем рэалізоўваць. Шмат знаходзіцца людзей, якія пачынаюць вынаходзіць веласіпед, — не трэба. Гэта ўсё ў нас ужо ёсць. Мэта пастаўлена, абазначана, і яе вельмі выразна падкрэслівае Усебеларускі народны сход», — заявіў Аляксандр Косінец.

# «МНЕ НЕАБЫЯКАВА І НЕМАЛАВАЖНА, ЯКІЯ БУДУЦЬ АДНОСІНЫ Ў МІНІСТЭРСТВЕ АБАРОНЫ»

## На што Прэзідэнт арыентуе новага начальніка Генеральнага штаба

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў генерал-маёра Паўла Муравейку начальнікам Генеральнага штаба, першым намеснікам міністра абароны. Павел Муравейка праходзіў службу на розных пасадах ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, з 2013 да 2022 года займаў пасаду начальніка галоўнага аператыўнага ўпраўлення — намесніка начальніка генеральнага штаба.**

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што вельмі важна, каб начальнік Генеральнага штаба і міністр абароны, спрацаваліся. «У нас міністр абароны, ёсць міністр абароны і яму падпарадкаваны ўсе ў Міністэрстве абароны. Але, тым не менш, начальнік Генеральнага штаба мае пэўную самастойнасць, непасрэдна займаецца планаваннем і арганізацыяй тых ці іншых ваенных мерапрыемстваў і ўсім тым, чым жывуць войскі. Вельмі тонкая грань паміж міністрам абароны і начальнікам генштаба», — падкрэсліў ён.

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, які прадстаўляў кандыдатуру Паўла Муравейкі, запэўніў, што і ён, і міністр абароны Віктар Хрэнін — дасведчаныя, кампетэнтныя людзі, якія адказваюць за ваенную бяспеку краіны. Па яго словах, абодва кіраўнікі аднолькава разумеюць сітуацыю і нацэлены на вынік. «Гэта дзяржаўныя людзі, і яны разумеюць, на якія пасады прызначаны і якіх мэт яны павінны дасягаць. І начальнік генштаба — самастойная фігура, ён непасрэдна адказвае за пытанні, звязаныя з будаўніцтвам і развіццём Узброеных Сіл, іх перспектывамі. З'яўляецца членам Савета бяспекі і правай рукой Прэзідэнта, Галоўнакамандуючага ў выпадку абвастрэння абстаноўкі, увядзення ваеннага становішча. Таму, я думаю, гэтыя людзі спрацуюцца», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

«Але ў той жа час і міністр абароны — не левая рука. Таму нам вельмі важна тут, каб вы знайшлі паразуменне. Вы ж і служылі разам, адзін аднаго ведаеце добра», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, што звярнуў увагу на гэты аспект не проста так. У сённяшняй няпростай сітуацыі Прэзідэнт назірае не толькі за абстаноўкай у краіне ў цэлым, але і за тым, як складваюцца справы на Узброеных Сілах у прыватнасці. «Мне неабыякава і немалаважна, якія будуць адносіны ў самім Міністэрстве абароны. Ад вас абодвух залежыць многае», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што не цярпіць хлусні: «Гэта дарэмна: рана ці позна ўсё ўсплыве. У Беларусі немагчыма падфарбаваць абстаноўку ці яшчэ штосьці». Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння неабходна развіваць Узброеныя Сілы так, як гэта рабілі заўсёды, — вывучаючы ўсё, што адбываецца навокал. Асабліва ён звярнуў увагу на ўрокі, вынесеныя з сітуацыі ва Украіне. «Мы бачым, якая сучасная вайна. Мы ўжо высновы для сябе зрабілі. Мы ўжо зразумелі, што такое міны і мінныя загароды, якія мы хацелі калісьці па ўказцы захаду знішчыць. Дзякуй богу, захавалі. Мы ведаем, што такое контрбатарэйная барацьба. І асабліва разумеем, што ў сучасных умовах без беспілотных лятальных апаратаў ваяваць немагчыма. А таксама без сістэмы радыёэлектроннай барацьбы, якая павінна ўздзейнічаць эфектыўна і на беспілотныя лятальныя апараты, і ўвогуле на іншыя сучасныя ўзбраенні. Мы пра гэта неадноўчы казалі, вам давядзецца грунтоўна гэтым заняцца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### СЁННЯ ЎСЕ СФЕРЫ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ КРАІНЫ ЗВЯЗАНЫ З БЯСПЕКАЙ

Размаўляючы з журналістамі, Павел МУРАВЕЙКА падзяліўся, што для яго новая пасада — важная і даволі цікавая прыступка ў кар'еры: «Пасада вельмі складаная, вельмі адказная, прадугледжвае шырокі дыяпазон абавязкаў і задач. Таму я ўдзячны кіраўніку дзяржавы за тое, што ён падтрымаў маю кандыдатуру пры назначэнні на пасаду начальніка Генеральнага штаба».

Павел Муравейка звярнуў увагу, што сёння ўсе сферы жыццядзейнасці краіны звязаны з ваеннай бяспекай. «Ёсць мір, не падаюць снарады, спакойна на нашых межах — значыць, мы можам вырошчваць хлеб, выхоўваць дзяцей, развіваць культуру і мастацтва, іншыя кірункі — гэта ўсё звязана з бяспекай. Наш Прэзідэнт, як Галоўнакамандуючы, вельмі тонка адчувае грань, якая забяспечвае спакой і парадак у краіне», — сказаў ён.

Генеральны штаб у сістэме забеспячэння нацыянальнай бяспекі, асабліва ваеннай бяспекі, з'яўляецца ключавым органам, які каардынуе войскі і воінскія фарміраванні ў рамках абароны краіны. Павел Муравейка расказаў, якім задачам генштаб будзе ўдзяляць найбольшую ўвагу.

«Сёння планаванне абароны і стратэгічнае планаванне ўвогуле — дастаткова складаны працэс, таму што становішча мяняецца штодзень. Гэта трэба ўлічваць, аналізаваць для таго, каб негатыўных праяў, выклікаў і пагроз нашай дзяржаве было як мага менш. Гэта адна з асноўных задач і функцый генеральнага штаба», — адзначыў ён.

Па словах начальніка генштаба, цяпер органы забеспячэння нацыянальнай бяспекі і Узброеныя Сілы як асноўны касцяк гэтай сістэмы знаходзяцца на піку сваёй актыўнасці і піку сваёй гатоўнасці. «Сёння прыняты ўсе лёсавызначальныя рашэнні, якія забяспечваюць функцыянаванне ваеннай арганізацыі дзяржавы ў гэтых складаных і няпростых умовах. Задача генеральнага штаба — аб'ектыўна ацэньваць абстаноўку і своечасова ўносіць карэктывы. З савецкіх часоў склалася, што вайсковая сістэма кансерватыўная. Задача Генеральнага штаба — зрабіць яе больш гнуткай, больш учэпістай на сучасныя выклікі і больш блізкай да людзей, каб нашы грамадзяне разумелі, што бяспека не бярэцца з паветра, яна куецца хлопцамі, якія служаць у войску, ахоўваюць нашы граніцы, патрулююць гарады ў міліцыі, ліквідуюць надзвычайныя сітуацыі», — расказаў Павел Муравейка. Яшчэ адной задачай, якая стаіць перад генштабам, ён назваў патрыятычнае выхаванне: «Патрыёта можна выхаваць. Але яго неабходна рыхтаваць, яму неабходна расказваць тыя складанасці і негатыўныя моманты, якія ўплываюць на нашу мірную будучыню і наша мірнае існаванне».

Міжнародны вектар

# РЭАЛІЗАВАЦЬ ДАМОЎЛЕНАСЦІ І ЗАХАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

## Якія пытанні абмяркавалі саюзныя парламентарыі

**У Волагдзе адбылося пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Беларускую дэлегацыю ўзначаліў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей Хаменка. Іншыя ўдзельнікі мерапрыемства па сродках відэаканферэнц-сувязі працавалі ў студыі верхняй палаты беларускага парламента ў Мінску.**



Фота БелТА.

На прыкладзе Валагодскай вобласці і Мінска бакі абмеркавалі рэалізацыю пагадненняў аб супрацоўніцтве, у тым ліку заключаных у рамках форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Асобна закранулі пытанне пашырэння расійска-беларускага ўзаемадзеяння па захаванні гістарычнай памяці і сувязі пакаленняў як асновы патрыятычнага выхавання моладзі.

### УЗОР ПАЛІТЫЧНАГА ДЫЯЛОГУ

Звяртаючыся да прысутных з прывітальным словам, **выконваючы абавязкі губернатара Валагодскай вобласці Георгій ФІЛІМОНАЎ** падкрэсліў, што Беларусь аднosіцца да ліку асноўных стратэгічных партнёраў Расіі. «Узровень палітычнага дыялогу дасягае на сёння найвышэйшых паказчыкаў, — адзначыў ён. — І гэты ўзровень палітычнага дыялогу і цеплыні ўзаемаадносін, які дэманструюць нашы лідары Уладзімір Пуцін і Аляксандр Лукашэнка, з'яўляецца для нас узорам, да якога мы павінны імкнуцца. Да найвышэйшага ўзроўню палітычнага дыялогу мы павінны падцягваць і ўзровень міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, партнёрства з нашымі калегамі з Беларусі ў плане рэалізацыі сумесных эканамічных праектаў».

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей ХАМЕНКА** назваў сімвалічным тое, што пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі праходзіць напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Гэтая дата — сімвал сяброўства і адзінства, калі ўсе разам мы дасягнулі той Перамогі, якая ў прынцыпе тэхнічна, як думалі асобныя заходнія аналітыкі, палітыкі, ваенныя, немагчымая. Усё магчыма — толькі разам», — падкрэсліў ён.

І дадаў, што Рэспубліка Беларусь і валагодская зямля вельмі падобныя. «З аднаго боку, адсутнасць у вялікай колькасці прыродных выкапняў, з іншага — наяўнасць сінявокіх азёр, развітыя прамысловасць, сельская гаспадарка, — канкрэтызаваў ён. — Аднак самым галоўным вашым і нашым здабыткам з'яўляюцца людзі. Гэта тыя патрыёты, якія шчыра любяць сваю Радзіму — Расійскую Федэрацыю і Рэспубліку Беларусь».

Сяргей Хаменка нагадаў, што сустрэча адбываецца напярэдадні XI Форуму рэгіёнаў, які ў канцы чэрвеня пройдзе на Віцебшчыне. «Цяпер ідзе вельмі дасканалая падрыхтоўка, — расказаў ён. — Тая колькасць мерапрыемстваў і ўдзельнікаў, якія плануюць прыбыць на форум, сведчаць аб узаемнай цікавасці. Асноўным паказчыкам гэтага мерапрыемства з'яўляецца развіццё эканомікі, росту дабрабыту грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Нашы кіраўнікі дзяржаў падаюць нам прыклад узаемадзеяння, прыклад, як трэба разбірацца ў кожнай дробязі, прыклад, як трэба сябраваць на карысць нашых дзяржаў».

### КАНТРАКТЫ — З КАНКРЭТНАЙ МЭТАЙ

Па словах **намесніка Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Юрыя ВАРАБ'ЕВА**, адносіны паміж Беларуссю і Расіяй маюць стратэгічнае значэнне, і задаюць тон гэтаму супрацоўніцтву нацыянальныя лідары. Ён адзначыў, што акурат у гэтыя дні запланаваны візіт Уладзіміра Пуціна ў Беларусь, дзе падчас сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам будуць намечаны новыя планы.

Кажучы аб штогадовым Форуме рэгіёнаў, Юрый Вараб'ёў падкрэсліў, што гэтае мерапрыемства дае магчымасць заключыць паміж нашымі краінамі пагадненні, дагаворы і камерцыйныя кантракты. «Некалькі гадоў таму мы вырашылі, што наша камісія, якая збіраецца ў прамежку паміж форумамі, будзе разглядаць важныя пытанні: як гэтыя дамоўленасці рэалізуюцца і наколькі яны карысныя, — нагадаў ён. — Магчыма, нешта сёння трэба дадаць, давесці да ладу, для таго, каб ад гэтых пагадненняў была карысць. Вядома, бізнес-кантракты ў асноўным носяць камерцыйны характар, там бізнесмены самі разбяруцца, а вось рэгіёны паміж сабой не заўсёды заключаюць кантракты з канкрэтнай мэтай. Часта гэта проста рука сяброўства, якая працягваецца, што, дарэчы, таксама нядрэнна»

Кажучы аб парадку дня камісіі, Юрый Вараб'ёў засярodзіў увагу на пытаннях, якія патрабуюць абмеркавання. «Першае — гэта рэалізацыя заключаных дагавораў паміж рэгіёнамі на прыкладзе Валагодскай вобласці і Мінска, — канкрэтызаваў ён. — Як вядома, Валагодская вобласць актыўна ўзаемадзейнічае з Беларуссю, заключаны дзясяткі пагадненняў. Як ужо адзначалася, тавараабарот склаў больш за 700 мільёнаў долараў, і гэта сведчыць аб тым, што нашы рэгіёны супрацоўнічаюць эфектыўна. Другое пытанне — гэта супрацоўніцтва ў галіне захавання гістарычнай памяці і сувязі пакаленняў. У апошнія гады Беларусь і Расія аказаліся пад беспрэцэдэнтным ціскам звонку. Агрэсіўным атакам падвяргаецца ўся наша гістарычная праўда, агульная перамога над нацызмам, памяць аб ахвярах вайны. Многае робіцца, каб наша моладзь памятала пра гэта. Найважнейшая задача нашага пакалення — перадаць гэтую памяць маладым».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ** адзначыў, што ўсе пытанні, якія разглядае і Форум рэгіёнаў, і парламенцкая камісія вельмі важныя. «Камісія сабрана ў новым фармаце, з новымі задачамі, — паведаміў сенатар. — У Гродна Наталля Іванаўна Качанава і Валянціна Іванаўна Матвіенка ўнеслі прапанову надаць міжпарламенцкай камісіі новы статус больш высокага ўзроўню кантролю за прынятымі рашэннямі. Мяркую, што такая форма кантролю і ўзаемадзеяння дазваляе аператыўна прымаць тыя рашэнні, якія ўжо фармалізаваны на форумах».

Па словах парламентарыя, Мінск у параўнанні з іншымі беларускімі гарадамі мае больш высокую долю ўдзелу ў развіцці Волагды, гэта вельмі добры паказчык. Таму будуць прыняты рашэнні, каб яшчэ больш ўзмацніць эканамічнае ўзаемадзеянне.

Што да патрыятычнага блоку пытанняў, вынесеных на абмеркаванне саюзных парламентарыяў, то Міхаіл Русы перакананы: нельга замоўчваць нашу гісторыю, трэба паказваць усёй сусветнай супольнасці ролю Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне. Па яго словах, тое, што зроблена і ў Беларусі, і ў Расійскай Федэрацыі па захаванні памяці, ваеннай, культурнай і духоўнай спадчыны дарагога варта. «Няма такога месца, дзе пахаваны салдат і стаіць помнік, каб яно не было дагледжана, абазначана, каб да яго не прыходзілі людзі, — падкрэсліў ён. — На прыкладзе Брэсцкай крэпасці мы рыхтуем унікальны цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі».

# У ФОКУСЕ — ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Якія важныя мэты ставілі перад сабой удзельнікі міжнароднага форуму? Асноўнай была выдзелена наступная — стварэнне міждзяржаўнай платформы для абмеркавання і вырашэння пытанняў і задач, звязаных з развіццём сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, фарміраваннем прафесійных кампетэнцый рабочых і спецыялістаў новага эканамічнага ўкладу, забеспячэнне ўстойлівага росту і развіцця міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Кіраўнік адукацыйнага ведамства Беларусі Андрэй Іванец падкрэсліў, што Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства вышэйшай адукацыі, навукі і інавацый Рэспублікі Узбекістан надаюць важнае значэнне пашыранню ўзаемадзеяння на ўсіх узроўнях адукацыі. Краіны актыўна супрацоўнічаюць у галіне навукі і адукацыі, рэалізоўваюць сумесныя праекты па абмене вопытам, навучанні і стажыроўцы педагагічных работнікаў.

— Сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь — не проста адна з найбуйнейшых галін сацыяльнай сферы, у якой звыш 7 тысяч устаноў адукацыі і больш за 2 мільёны навучэнцаў. Гэта яшчэ і найважнейшы складнік жыцця ўсяго беларускага народа. Цяпер нацыянальная сістэма адукацыі адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляе да яе грамадства і дзяржава, стабільна працуе і паступова развіваецца. Асноўныя напрамкі вызначаны да 2030 года, — сказаў міністр.

Як расказаў кіраўнік галіны, у прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі павышаная ўвага ўдзяляецца эфектыўнасці сістэмы падрыхтоўкі рабочых і служачых у кадравым забеспячэнні інавацыйнай эканомікі. Асноўныя задачы — абнаўленне зместу адукацыйных праграм, стварэнне сучаснага адукацыйнага асяроддзя і ўмоў для развіцця інклюзіўнай адукацыі, удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных кадраў, павышэнне прывабнасці рабочых прафесій і іншыя. Андрэй Іванец канстатаваў, што ў Беларусі паспяхова працуе эфектыўная мадэль прафесійнай адукацыі: «Створаны 52 цэнтры кампетэнцый, якія працуюць ва ўсіх абласцях нашай краіны. У распрацоўцы адукацыйных праграм удзельнічаюць профільныя міністэрствы і прадпрыемствы. Гэта работа асабліва важная, бо кожны павінен даць адказ, наколькі эфектыўная сёння падрыхтоўка кадраў».

Кіраўнік міністэрства падкрэсліў, што сёння ў сістэме вышэйшай адукацыі рэспублікі прыярытэт аддаюць павышэнню якасці практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў, эфектыўнасці ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў. Не менш увагі — развіццю інавацыйнай інфраструктуры універсітэтаў. Навукова-даследчая дзейнасць арыентавана на павышэнне яе рэзультатыўнасці, а таксама на стварэнне ўмоў для прыцягнення моладзі да навуковай і выкладчыцкай работы.

Прывёў міністр і той факт, што колькасць замежных грамадзян, якія вучацца ў беларускіх ВНУ, пастаянна расце, і сёння іх каля 30 тысяч са 107 краін свету. Што да ўзбекскіх студэнтаў, то іх у нас навучаецца больш за пяць тысяч чалавек.

### ТАШКЕНТ — СТАЛІЦА МОЛАДЗІ

У бягучым годзе галоўны горад Рэспублікі Узбекістан вызначаны маладзёжнай сталіцай СНД. У сувязі з гэтым беларускі бок выказаў гатоўнасць развіваць кантакты паміж моладдзю Беларусі і Узбекістана, праводзіць сумесныя мерапрыемствы, развіваць іншыя формы ўзаемадзеяння. У сваю чаргу ўзбекскія калегі выказалі жаданне наладжваць удзел сваіх студэнтаў вышэйшых адукацыйных устаноў Рэспублікі Узбекістан у беларускіх студэнцкіх атрадах, арганізоўваць для іх вытворчую практыку на буйных прамысловых прадпрыемствах Беларусі, а яшчэ — даць магчымасць удзельнікам студэнцкіх атрадаў атрымаць разрад па рабочай прафесіі.

Адну з перспектыў супрацоўніцтва ў доўгую скрыню вырашылі не адкладаць і дамовіліся ў найбліжэйшы час прапрацаваць пытанне аб арганізацыі навукова-тэхналагічнага кансорцыума паміж вядучымі вучонымі і даследчыкамі дзвюх краін і фінансаванні праграм сумесных навукова-тэхнічных праектаў. Ішла размова і аб накіраванні прафесарска-выкладчыцкага складу і навуковых супрацоўнікаў універсітэтаў Узбекістана, якія рыхтуюць кадры ў інжынерна-тэхнічнай галіне, на стажыроўку ў навуковыя ўстановы і ўстановы вышэйшай адукацыі Беларусі.

У час візіту ўзбекскай дэлегацыі не пуставалі актавыя залы і аўдыторыі беларускіх універсітэтаў і каледжаў — там паміж спецыялістамі ў галіне адукацыі ішоў абмен вопытам у частцы мадэрнізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі па такіх кірунках, як стварэнне і функцыянаванне цэнтраў кампетэнцый, арганізацыйна- і навукова-метадычнае забеспячэнне іх дзейнасці ў сеткавай форме ўзаемадзеяння. Разглядаліся аспекты духоўна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Гаварылася аб лічбавізацыі ў прафесійнай адукацыі і аб выкарыстанні ва ўстановах адукацыі інавацыйных падыходаў у арганізацыі прафарыентацыйнай і выхаваўчай работы.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

### ВЫНІКІ

Двухбаковыя пагадненні аб супрацоўніцтве былі падпісаны паміж 14 беларускімі каледжамі і 14 каледжамі, тэхнікумамі і прафесійнымі школамі Рэспублікі Узбекістан.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь восьмага і трынаццатага скліканняў, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў, вядомага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Марыі Мікалаеўны ХУДОЙ і выказваюць глыбокія спачуванні яе родным і блізкім.**

# «ШЭРАЯ» ЗАРПЛАТА — СУМНЫЯ ВЫНІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле яго слоў, работа па скарачэнні выпадкаў выплаты «шэрай» зарплаты і мінімізацыі наступстваў такіх выплат вядзецца па некалькіх кірунках. Першы — гэта выяўленне злачынстваў і іншых правапарушэнняў, звязаных з выплатай зарпллаты «ў канвертах». У 2023 годзе органамі Камітэта дзяржаўнага кантролю праведзена 62 праверкі і выяўлены 103 злачынствы. Сума дадаткова прад'яўленага падаходнага падатку і страхавыя ўзносы склала звыш 24 мільёнаў рублёў. Рост выяўленых злачынстваў — гэта вынік асаблівай увагі да дадзенай тэматыцы кантралявальных і праваахоўных органаў і актывізацыя іх працы ў гэтым кірунку, павышэнне ўзроўню іх узаемадзеяння.

«У 2022 годзе намі спынена незаконная дзейнасць дзвюх брэсцкіх будаўнічых кампаній, звязаная з выплатай работнікам зарплаты «ў канвертах» і ўхіленнем ад выплаты як страхавых узносаў у ФСАН, так і падаходнага падатку. У ходзе расследавання крымінальных спраў устаноўлена, што на працягу больш за пяць гадоў звыш 1300 работнікаў атрымлівалі зарплату ў выглядзе камандзіровачных расходаў. Агульная сума такіх выплат склала звыш 31 мільёна рублёў, а сума нявыплачанага падаходнага падатку і страхавых узносаў перавысіла 4 і 10 мільёнаў адпаведна. Па выніках расследавання крымінальнай справы, суд вынес пакаранне ў дачыненні да галоўных бухгалтараў прадпрыемстваў у выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на пяць гадоў са штрафам і забаронай на працягу пяці гадоў займацца адпаведнай дзейнасцю», — расказаў Юрый Кардымон.

**Важным кірункам па выяўленні «шэрых» зарплат з'яўляецца кантроль за адпаведнасцю даходаў і выдаткаў фізічнай асобы — удзельніка схемы. У схеме заўсёды задзейнічаныя двое: наймальнік, які выплачвае заробак «у канверце», і работнік, які згаджаецца на гэта.**

У сакавіку 2022 года было падпісана пагадненне аб парадку ўзаемадзеяння органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, падатковых органаў, органаў унутраных спраў і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў мэтах выяўлення і спынення выплат зарплаты «ў канвертах». Асноўная мэта — вызначэнне выразнага і эфектыўнага механізму ўзаемадзеяння, выключэнне дублявання функцый дзяржорганаў і вызначэнне кожнаму з пералічаных сваёй нішы ў сістэме выяўлення і спынення выдачы «шэрых» зарплат. Акрамя таго, сёння актыўна дзейнічае міжведамасная рабочая група, якая выконвае ролю каардынацыйнага цэнтра.

Юрый Кардымон паведаміў, што сёння вядзецца праверка інфармацыі, якая паступае на анлайн-панэль зваротнай сувязі «Скажы «не» зарплаце «ў канверце», якая размешчана на сайце Камітэта дзяржаўнага кантролю. «Гэтая інтэрнэт-панэль была створана ў маі 2021 года. З яе дапамогай грамадзяне могуць ананімна паведаміць пра факты парушэнняў. Уся інфармацыя сістэматызуецца, аналізуецца і выкарыстоўваецца пры планаванні праверачных мерапрыемстваў. У 2023 годзе паступіла 269 паведамленняў ад грамадзян. Пераважная большасць — каля 70 працэнтаў звaротаў — датычыцца суб'ектаў сталіцы і Мінскай вобласці. У шэрагу выпадкаў інфармацыя была пацверджана і выкарыстана пры правядзенні праверачных мерапрыемстваў», — падкрэсліў ён.

На думку Юрыя Кардымона, у выніку сістэматычнай і планамернай работы ўсіх дзяржаўных органаў наймальнікі сталі больш адказна ставіцца да захавання заканадаўства. Колькасць арганізацый, у якіх выдаюць заробак «у канвертах», значна скарацілася.

## ДАХОДЫ І ВЫДАТКІ

«Праваахоўнікі, кантралявальныя органы ў першую чаргу арыентаваны на выяўленне суб'ектаў гаспадарання, якія выплачваюць зарплату «ў канвертах», хаваюць выручку», — дадаў **начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.** — Але мы выдатна разумеем, што канчатковая мэта вываду сродкаў у ценявы абарот — спажыванне, гэта значыць, груба кажучы, пакласці ў кішэню службовай асобе альбо наёмнаму работніку, які спрабуе мінімізаваць падатковыя абавязацельствы перад дзяржавай і такім чынам максімізаваць свой прыбытак».



Фота БелТА.

Важным кірункам па выяўленні «шэрых» зарплат з'яўляецца кантроль за адпаведнасцю даходаў і выдаткаў фізічнай асобы — удзельніка схемы. У схеме заўсёды задзейнічаныя двое: наймальнік, які выплачвае заробак «у канверце», і работнік, які згаджаецца на гэта. «Штогод падатковымі органамі аналізуецца каля 200 тысяч грамадзян нашай краіны. Вывучаюцца даходы, зарплаты, набыццё featurрознай маёмасці, перасоўванне праз мяжу транспартных сродкаў, валюты. Гэты масіў інфармацыі апрацоўваецца спецыяльнай камп'ютарнай сістэмай, што дазваляе выяўляць асоб, у якіх выдаткі значна перавышаюць даходы», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Такі кантроль ажыццяўляецца ў дачыненні да фізічнай асобы за 10 гадоў. У дачыненні да асоб, у якіх выдаткі значна перавышаюць даходы, праводзіцца падатковая праверка. Прапануецца прадставіць тлумачэнні аб крыніцах даходаў, за кошт якіх набыта маёмасць і панесены іншыя выдаткі. «Статыстыка сведчыць, што ў большасці выпадкаў тыя асобы, якія былі адабраны для правядзення праверак, не могуць патлумачыць легальнае паходжанне сваіх крыніц даходаў. Выніковасць праверак, паводле статыстыкі за мінулы год, складае 70 працэнтаў. Тым, хто не змог пацвердзіць паходжанне даходаў, налічаць падатак па павышанай стаўцы 26 % (гэта двухразовы памер стандартнай стаўкі падаходнага падатку 13 %)», — патлумачыў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб.

Паводле яго слоў, летась больш за 2,5 тысячы грамадзян не змаглі пацвердзіць паходжанне даходаў. Агульная сума перавышэння расходаў над даходамі, якую не змаглі пацвердзіць, склала 102 мільёны рублёў. Грамадзянам прад'яўлена ў выплаце падаткаў на суму практычна ў 29 мільёнаў рублёў. Гэта велічэзны аб'ём, які сведчыць пра тое, як за апошнія 10 гадоў людзі спрабавалі выводзіць з легальнага абароту свае даходы.

## СХЕМЫ ЎХІЛЕННЯ АД ВЫПЛАТЫ

«Дзяржаўны кантроль, што ажыццяўляецца падатковай службай, сканцэнтраваны на плацельшчыках, якія наўмысна парушаюць дзеючае заканадаўства і выкарыстоўваюць схемы для ўхілення ад падаткаабкладанняў, — патлумачыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Галіна КАВАЛЁВА.** — Калі ў суб'ектаў гаспадарання маецца магчымасць выплачваць заработную плату «ў канвертах», значыць, маюцца няўлічаныя грашовыя сродкі, якія служаць крыніцай такіх выплат».

Выяўляюцца падатковымі органамі парушэнні, якія звязаны з утойваннем выручкі, асабліва калі дзейнасць суб'екта гаспадарання звязана з прыёмам наяўных грашовых сродкаў, нізкім узроўнем безнаяўных разлікаў, з выкарыстаннем схем ухілення ад выплаты падаткаў. Гэта з'яўляецца дадатковым сігналам таго, што незаконна сэканомленыя суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці грашовыя сродкі ідуць на неафіцыйныя выплаты заработнай платы. Часта афіцыйна заяўленыя заработныя платы ледзь дасягаюць мінімальнага памеру.

«Напрыклад, у ходзе кантрольных мерапрыемстваў устаноўлена, што ў васьмі кафэ прыём наяўных грашовых сродкаў ажыццяўляўся з парушэннем устаноўленага парадку. Частка грашовых сродкаў хавалася ад падаткаабкладання і перадавалася ўладальнікам бізнесу, якія знаходзіліся за межамі Беларусі, а таксама выкарыстоўвалася на выплату зарплат «у канвертах» работнікам, у тым ліку тым, з якімі не былі аформлены працоўныя стасункі. Пры правядзенні праверкі былі канфіскаваны чарнавыя запісы, якія ўтрымліваюць звесткі аб схаванай выручцы на суму 2 мільёны 200 тысяч рублёў, а таксама звесткі аб выплаце работнікам зарплат «у канвертах». 300 службовых асоб прадпрыемства пацвердзілі факты ўтойвання выручкі і атрымання зарплаты «ў канверце», — расказала Галіна Кавалёва.

Па яе словах, у 2023 годзе на адрас суб'ектаў гаспадарання накіравана 70 тысяч паведамленняў і апавяшчэнняў у рамках генеральнага кантролю. Сума, якая падлягае даплаце, складае 52 мільёны рублёў. Па выніках 226 маніторынгаў, у тым жа годзе ў адрас плацельшчыкаў накіравана рэкамендацыя аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў. У 2023 годзе праведзена каля 1181 праверкі, па выніках якіх прад'яўлена падаходнага падатку на суму 92 мільёны рублёў, накладзена адміністрацыйнае спагнанне на 10 мільёнаў рублёў.

## ФСАН ПАЛІЧЫЎ СТРАТЫ РАБОТНІКАЎ

— У склад Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўваходзіць кантралявальны орган — Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і орган нагляду — Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы, якія ў сукупнасці ажыццяўляюць кантроль і нагляд за гэтай тэматыкай, — расказала **першы намеснік кіраўніка Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ТРУХАН.** — У нашай краіне права грамадзян на атрыманне пенсій па ўзросце напрамую звязана з наяўнасцю да дня дасягнення пенсіённага ўзросту (для мужчын — 63 гады, для жанчын — 58 гадоў) пэўнага перыяду выплаты абавязковых страхавых узносаў і агульнага стажу (для жанчын — 20 гадоў, для мужчын — 25 гадоў). Пры выкананні гэтых умоў грамадзяніну даецца права на годную працоўную пенсію па ўзросце».

Як адзначыла Вікторыя Трухан, своечасовая і поўная выплата ўзносаў у бюджэт ФСАН служыць асновай для забеспячэння 47 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якім грамадзяне маюць права на сацыяльнае забеспячэнне, атрыманне сацыяльных выплат. Такім чынам, бюджэт ФСАН з'яўляецца асноўнай і адзінай крыніцай выплат у рамках забеспячэння дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. З бюджэту фонду штомесяц фінансуюцца выплаты пенсій, выплаты парадку 10 мільёнаў дапамог.

**У выніку сістэматычнай і планамернай работы ўсіх дзяржаўных органаў наймальнікі сталі больш адказна ставіцца да захавання заканадаўства. Колькасць арганізацый, у якіх выдаюць заробак «у канвертах», значна скарацілася.**

Пачынаючы з чэрвеня 2021 года да першага квартала 2024 года, праверкі выявілі недаплату сацыяльных узносаў у фонд на суму 51 мільён рублёў. Недаплата выяўлена амаль у дзвюх тысячах суб'ектаў гаспадарання і ахоплівае 13,4 тысячы работнікаў.

Былі падлічаны страты работнікаў, якія атрымліваюць мінімальную заработную плату або ніжэй. «Напрыклад, у работніка быў бальнічны ліст з 1 да 7 лютага 2024 года. Калі ён працаваў пры афіцыйным акладзе 626 рублёў, то за перыяд часовай непрацаздольнасці з такім акладам і астатняй часткай зарплаты ў канверце ён атрымае кампенсацыю ў 120 рублёў 90 капеек. Калі ж ён мае афіцыйны аклад, сярэдні для работнікаў краіны, і атрымаў за студзень 1991 рубель 20 капеек, сума па часовай непрацаздольнасці складзе 384 рублі 50 капеек», — падлічыла Вікторыя Трухан.

Таксама была падлічана выплата для жанчын, якія сыходзяць у адпачынак па доглядзе дзіцяці. Яна залежыць ад узроўню заработнай платы. «Калі жанчына працуе на ўмовах няпоўнай занятасці на 0,25 стаўкі, а гэта 200 рублёў, то яна дапамогу па цяжарнасці і родах атрымае ўсяго 858 рублёў 42 капейкі. Калі гэта мінімальная заработная плата, то атрымае 2501 рубель 10 капеек. Калі мае сярэднюю заработную плату па краіне, то атрымае 8728,9 рубля», — падагульніла першы намеснік кіраўніка ФСАН.

У 2022 годзе ФСАН запусціў мабільны дадатак з вялікімі магчымасцямі. Пры дапамозе яго любы грамадзянін можа адсачыць, у якім памеры выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы яго работадаўцам.

## НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ, КАМАНДЗІРОЎКІ І ПРАЦОЎНЫЯ АДПАЧЫНКІ

«Згаджаючыся атрымліваць заработную плату «ў канвертах», вы губляеце права на дзяржаўную абарону ў поўным аб'ёме ў выпадку ўзнікнення нестандартнай сітуацыі, — расказала **намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына ГРЫШУКЕВІЧ.** — Калі з работнікам адбудзецца няшчасны выпадак на вытворчасці, яго сваякі змогуць атрымаць страхавыя выплаты зыходзячы толькі з афіцыйна налічанай заработнай платы. З'язджаючы ў працоўны адпачынак, камандзіроўку, работнік, які пагадзіўся на «шэрую» зарплату, прэтэндуе толькі на тую частку заработнай платы, што афіцыйна налічана. Усё астатняе — воля работадаўцы».

«Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы аналізуе інфармацыю за першы квартал бягучага года ў дачыненні да тых наймальнікаў, у якіх зарплата не вышэйшая за мінімальную, з улікам відаў дзейнасці арганізацый, умоў працы (няпоўны працоўны час або водпуск без захавання або з частковым захаваннем заработнай платы). У месяц адпрацоўваецца каля 130 такіх арганізацый. У выпадках, калі ўзнікаюць сумневы з нагоды добрасумленнага налічэння заработнай платы, інфармацыя накіроўваецца ў Міністэрства па падатках і зборах, каб яны мелі магчымасць вызначыць выпадкі выплаты зарплаты «ў канвертах», — падагульніла Марына Грышукевіч.

Падпісваючы працоўны дагавор, неабходна ўважліва вывучыць пункты, якія датычацца заработнай платы, і настойваць на тым, каб заработная плата была адлюстравана ў поўным аб'ёме, параілі прадстаўнікі міністэрства і галоўнага кантралявальнага органа дзяржавы.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# КІНО З ГІСТОРЫЯЙ

## На «Беларусь 3» убачым «Біяграфію маёй рэспублікі»

**У рамках эфірных акцый, прымеркаваных да векавога юбілею беларускага кінематографа, сацыякультурны тэлеканал працягвае знаёміць гледачоў са здабыткамі залатога фонду Белтэлерадыёкампаніі. Так, з 27 мая ў эфіры «Беларусь 3» пакажуць 6-серыйны дакументальна-хранікальны фільм «Біяграфія маёй рэспублікі».**

У аснове кінастужкі (1968, рэжысёры — І. Рудамётаў, В. Карпілаў, І. Вейняровіч, У. Станкевіч, А. Ястрабаў) — унікальныя дакументальныя кадры, якія аўтарам давялося збіраць у беларускіх і расійскіх архівах, а таксама рэдкія кадры значных падзей, зафіксаваныя рэжысёрамі Беларускага тэлебачання. Фільм, створаны да 50-годдзя БССР, падрабязна распавядае пра гісторыю развіцця нашай краіны і дасягненні народа ў розных сферах. Відэастужка з фільмам «Біяграфія маёй рэспублікі» захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў. Літаральна нядаўна спецыялісты галоўнай дырэкцыі фондавых матэрыялаў генеральнага прадзюсарскага цэнтра Белтэлерадыёкампаніі пачалі работу па алічбоўванню фільма.

